1. *Вялікае* княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2005–2006. – Т. 1: Абаленскі–Кадэнцыя. – 2005. – 688 с.: іл.

2. *Вялікае* княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2005–2006. – Т. 2: Кадэцкі корпус–Яцкевіч. – 2006. – 792 с.: іл.

3. *Дыяруш* князя Міхаіла Казіміра Радзівіла, ваяводы віленскага, гетмана ВКЛ // Спадчына. – 1994. – № 4.

4. *Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры 18 стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 256 с.

5. *Тананаева, Л. И.* Сарматский портрет. Из эпохи польского портрета эпохи барокко / Л. И. Тананаева; под ред. докт. искусствоведения В. Н. Прокофьева. – Москва: Наука, 1979. – 304 с.: ил.

6. *Хадыка, А. Ю.* Непаўторныя рысы. З гісторыі беларускага партрэта / А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*І. М. Цэван, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – І. А. Малахава,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ТЭРМІНА “ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ” Ў СУЧАСНЫХ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

Каштоўнасці выступаюць асновай жыццядзейнасці як для асобнага чалавека, так і для групы людзей, пэўнага этнасу, чалавецтва цалкам. Нягледзячы на вялікую колькасць дысертацыйных даследаванняў, прысвечаных каштоўнасным арыентацыям асобы, можна адзначыць адзінкавыя прыклады работ, прысвечаных вывучэнню тэарэтычных і практычных аспектаў менавіта этнакультурных каштоўнасцей. Пераважна пасля 2000 г. з’явіліся нешматлікія дысертацыі расійскіх аўтараў, у назве якіх заяўлены тэрмін “этнакультурныя каштоўнасці”. Сучасныя падыходы да яго вывучэння ўяўляюць сабой сінтэз розных навуковых кірункаў, методык і метадалогій, але трэба адзначыць, што да гэтага часу сутнасць, структура і спецыфіка ўжывання дадзенага тэрміна дакладна не вызначаны.

Навуковым асэнсаваннем дадзенага феномену займаецца А. А. Гушчына, на яе думку, імкненне да захавання ўласных каштоўнасцей, традыцый, мовы, культуры, этнічнай самасвядомасці, выступае ў якасці неабходнай формы захавання і развіцця этнасаў [3, с. 13]. Спроба аўтара вызначыць тэрмін "этнакультурныя каштоўнасці" цесна звязаная з вывучэннем разнастайных роднасных паняццяў. Аўтар прыводзіць уласныя тлумачэнні такіх тэрмінаў, як "сацыялізацыя", "сацыяльная адаптацыя", "этнас", "этнічная ідэнтычнасць", "менталітэт", "этнічныя групы", "каштоўнасці", "каштоўнасныя арыентацыі" і іншыя.

Уласна *этнакультурныя каштоўнасці* аўтар разумее як сукупнасць каштоўнасцей матэрыяльнага і духоўнага жыцця этнасу: прырода, народныя традыцыі, народнае мастацтва, народны побыт, усё тое, на чым засноўваецца менталітэт этнасу. Яны абумоўлены гісторыка-генетычна, геаграфічна і ментальна-псіхалагічна. Фарміраванне этнакультурных каштоўнасцей можна вызначыць, калі яны становяцца элементамі або феноменам дадзенай культуры і пачынаюць вызначаць індывідуальныя і групавыя, а затым масавыя паводзіны [3, с. 50–51]. Прыярытэтнымі крыніцамі этнакультурных каштоўнасцей аўтар называе наступныя паняцці і групы паняццяў: прырода; слова; справа, дзеяннне, дзейнасць, праца; зносіны; свабода; традыцыя; побыт (сям'я); рэлігія; прыклад.

Н. М. Бадмахалгаева пайшла па шляху вывучэння "этнакультурных каштоўнасцей" праз паняцці "мова" і "культура". Адсюль аўтар выносіць наступнае тлумачэнне тэрміна: *этнакультурныя каштоўнасці* з'яўляюцца сукупнасцю каштоўнасцей матэрыяльнага і духоўнага жыцця этнасу: прырода, народны побыт, святочная культура, гісторыя, традыцыі адукацыі і выхавання, мастацтва, ідэалы – усё тое, што засноўваецца на адзінстве мовы і культуры этнасу [2, с. 10].

Заслугоўваюць увагі наступныя тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна складаючых культуры. Згодна з аўтарам, культура ёсць складанае цэлае, з'яўленне каторага было непазбежным, паколькі ў самой чалавечай прыродзе закладзены такія патрэбнасці, каторыя павінны былі спрыяць з'яўленню культуры; культура з'яўляецца прадуктам сацыяльнай (а не біялагічнай) актыўнасці чалавека; культура прайшла пэўныя этапы свайго развіцця, прычым кожнае новае пакаленне

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

робіць свой унёсак, таму культура назапашвае, акумулюе матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці; культура важная для станаўлення чалавечай асобы; культура характарызуецца аб'ектыўнай немагчымасцю выдалення і, такім чынам, немагчымасцю для членаў калектыву пазбягаць культурнага ўздзеяння гэтага калектыву. Культурныя каштоўнасці не "зношваюцца", не старэюць, а пастаянна прымножваюць духоўнае багацце грамадства [2, с. 15–16]. У сувязі з гэтым, аўтарам *этнакультурныя каштоўнасці* вызначаюцца як сукупнасць матэрыяльнай, побытавай, духоўнай, мастацкай культуры, традыцый, мовы, якія выпрацаваны пакаленнямі і маюць спецыфічны змест і формы, абумоўленыя гісторыка-генетычна, геаграфічна і ментальна (псіхалагічна) [2, с. 30].

У параўнанні з папярэднімі, аўтары Н. А. Ільінава [5] і Ц. А. Бадмаева [1] вельмі спецыфічна, на наш погляд, ставяцца да паняцця "этнакультурныя каштоўнасці". Выносячы ў назву сваіх дысертацыйных даследаванняў дадзенае словазлучэнне, яны так і не даюць яго дакладнага тлумачэння ў тэксце, а абмяжоўваюцца толькі паняццямі "каштоўнасныя арыентацыі" і "каштоўнасці" [5] або "культура", "традыцыя", "этнас" [1], або падаюць тлумачэнне тэрмінаў "каштоўнасці", "этнакультура", "нацыянальныя каштоўнасці", "этнічныя каштоўнасныя арыентацыі асобы", "этнічныя канстанты культуры", "этнічная карціна свету" [1], але ў выніку так і не ўдакладняюць сваё разуменне галоўнага паняцця "этнакультурныя каштоўнасці" і не размяжоўваюць яго з іншымі роднаснымі паняццямі. Прааналізаваўшы работы дадзеных аўтараў, застаецца адкрытым пытанне аб мэтазгоднасці вынясення самога тэрміна "этнакультурныя каштоўнасці" ў назву дысертацый і аб адначасовай адсутнасці яго аўтарскай трактоўкі непасрэдна ў тэксце.

Па-свойму даследуе "этнакультурныя каштоўнасці" В. М. Джашакуеў, ён таксама звяртаецца да такіх складаных паняццяў, як "этнас", "культура", "этнічная культура", "этнакультурная прастора", "каштоўнасці", "каштоўнасныя арыентацыі" і падае іх трактоўку. Далей жа ён падмяняе тэрмін "этнакультурныя каштоўнасці" на "ўзровень развіцця культурных каштоўнасцей этнасу", лічыць іх тоеснымі, але ў выніку так і не дае больш-менш грунтоўнага азначэння. Аўтар бачыць залежнасць ўзроўню развіцця культурных каштоўнасцей этнасу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад: самабытнасці культурнай спадчыны этнасу, суадносінаў культурных каштоўнасцей этнасу з агульначалавечымі, агульнадзяржаўнымі, рэгіянальнымі, нацыянальнымі каштоўнасцямі, канстытуцыйнымі і заканадаўчымі актамі [4, с. 22].

Цяжка прасачыць логіку аўтара, калі ім адначасова “не ставілася задача даць усеабдымны аналіз этнакультурных каштоўнасцей”, выносячы гэтае словазлучэнне ў назву дысертацыі, і тым не не менш, без уласна вызначэння тэрміна аўтар далей па тэксту дае яго класіфікацыю і вылучае 6 каштоўнасцей: айчына, праца, сям’я, герантатымія (павага да старэйшых), гасціннасць [4, с. 24–25].

Такім чынам, аналіз навуковых работ некаторых сучасных расійскіх аўтараў, прысвечаных тэарэтычным і практычным праблемам этнакультурных каштоўнасцей асобы, паказвае на некаторыя асаблівасці выкарыстання тэрміна “этнакультурныя каштоўнасці”. Назіраецца недастатковая асэнсаванасць вучонымі дадзенага феномену і нават адсутнасць яго тлумачэння ў работах, цалкам прысвечаных дадзеным пытанням. Мае месца неразмежаванасць або падмена паняцця “этнакультурныя каштоўнасці” іншымі роднаснымі паняццямі. Абазначаныя тэрміналагічныя праблемы застаюцца актуальнымі, патрабуюць дальнейшай навуковай распрацоўкі і асэнсавання.

1. *Бадмаева, Ц. А.* Этнокультурные ценности калмыков: дис. … канд. филос. наук.: 09.00.13 / Ц. А. Бадмаева. − Элиста, 2007. − 159 л.

2. *Бадмахалгаева, Н. М.* Формирование этнокультурных ценностей у старшеклассников в процессе обучения русскому языку: дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Н. М. Бадмахалгаева. − Элиста, 2005. − 167 л.

3. *Гущина, О. А.* Педагогические условия формирования этнокультурных ценностей у будущих психологов в системе вузовского образования: дис. … канд. пед. наук: 13.00.08 / О. А. Гущина. − Чебоксары, 2006. − 226 л.

4. *Джашакуев, В. М.* Формирование у старшеклассников этнокультурных ценностей в процессе изучения краеведческих дисциплин: дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / В. М. Джашакуев. − Карачаевск, 2002. − 198 л.

5. *Ильинова, Н. А.* Этнокультурные ценности и традиции как фактор социализации личности в современных условиях: на материалах Республики Адыгея: дис. … канд. социол. наук: 22.00.06 / Н. А. Ильинова. − Майкоп, 2003. − 150 л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ